насць: манархія - справа пад рэлігіяй, злева пад навукай - сацыялізм, у граніцы - адмаўленне усіх дзяржаўных форм - анархізм.

І, канчаткова, апошні, базісны узровень - гэта развažанні пра самога чалавека, пра тое, хто з'яўляецца суб'ектам, можна сказаць, носьбітам, і усіх форм уласнага жыццяўладкавання, і суб'ектам погляда на іх - носьбітам светапогляду. Гэта - прадстаўленне аб чалавеку, якое размяжоўваецца у апазіцыі: злева - асоба, справа - "саборнасць" ці "татальнасць".

У выніку, руская філасофія XIX стагоддзя структуруецца на трох узроўнях, кожны з каторых мае свае полюсы. Верхні узровень - узровень светапогляду, размяжоўваемы у граніцах "рэлігія - навука"; сярэдні узровень - узровень формы уладкавання чалавечага быцця: "манархія - анархія"; ніжэйшы, фундаментальны узровень - прадстаўленне аб самім чалавеку: "асоба - татальнасць".

## ПЫТАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА У БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ КРЫТЫЦЫ 1920-х ГАДОЎ

У.К.Зяневіч

Нацыянальна-культурнае адраджэньне 1920-х гг. суправаджалася інтэнсіўным разьвіцьцем музычнага і агульначалавечага у мастацтве і у музыцы у прыватнасьці.

У гэты перыяд актыўна фармiруюцца канцэпцыі нацыянальнай музыкі, якія адлюстравалі эстэтычныя погляды і грамадска-палітычныя арыентацыі розных сацыяльных і нацыянальных груп насельніцтва Беларусі 1920 гг.

Выявіліся дзве палярна супрацьлеглыя тэндэнцыі, якія сваімі карэньнямі мелі, па-першае, старую нацыянал-шавіністычную палітыку царскага ураду у дносінах да культур "окраін Российской империи", так званы "заходнерусізм". Паводле тэорыі "западнарусізму", якія у беларускім друку 1920-гг. набылі назву "нацыянальнага нігілізму", будучыня беларускай культуры, лёс музычнага мастацтва залежала ад таго, у якой ступені "сацыялістычная Беларусь" здолее пераадоліць старое, традыцыю, "блеяньне нуднае ягнят", гэта значыць, у якой ступені Беларусь здо-

льная будзе выракчыся сваей нацыянальнай адметнасьці, мовы, фальклору і прафесійнага мастацтва, якое грунтуецца на сваіх уласных традыцыях.

"Нацыянальны нігілізм" арыентаваў дзеячоў беларускай музыкі на нівіліраваньне нацыянальна адметнага; пад лозунгам сацыялістычнай, пралетарскай культуры, імкнуўся праводзіць старую палітыку русіфікацыі музычнай адукацыі і выхаваньня, арыентацыі толькі на культуру "велікарускага" народа.

Другая тэндэнцыя адлюстравала погляды нацыянальна дэмакратычнай інтэлігенцыі Беларусі, якія былі сфармуляваны яшчэ напачатку XX стагоддзя аўтарамі "Нашай Нівы".

Нацыянальная культура разумеецца, як складаная сістэма, улонне дзе нараджаюцца духоўныя вартасьці чалавецтва, паасобных народаў і індывіда. Лідэры беларускай мастацкай культуры 1920-х гг. М.Чуркін, Ул.Тэраўскі, А.Гранeвіч, М.Равенскі і др. сьцвярджалі ідэю патэнцыяльнай творчай раўназначнасьці народаў сьвету у сьферы духоўнай творчасьці, даводзілі факт унікальнасьці, творчай непаўторнасьці, арыгінальнасьці нацыянальных музычных традыцый. Яны даводзілі неабходнасьць гарманічнай збалансаванасьці, узаемадзеньня нацыянальнага і агульначалавечага элементаў у сістэме нацыянальнай мастацкай культуры.

Гэта тэорыя нацыянальнага аптымізму служка сьцьвярджала здольнасць беларускай музыкі да развіцця на аснове нацыянальнай мовы, фальклору і тых каштоўнасьцей у галіне музычнага мастацтва, якая выпрацавала агульнаеўрапейская традыцыя.

Беларуская музычная крытыка даводзіла ў 1920-х гг., што гісторыя беларускай музыкі, гэта гісторыя складаных узаемакарысных адносін Беларусі і другіх краін эўрапейскага рэгіёну, і сама беларуская музыка развіваецца як музыка, менавіта, еўрапейская.

Фактам, які пацьвярджае правільнасць такога пункту гледжаньня быў і бурны роскаіт беларускага нацыянальнага музычнага мастацтва 1920-х гг., натхніцелем якога і стала пазітыўная ідэя нацыянальнага адраджэньня, укключаньне беларусаў у агульнаеўрапейскі музычна-культурны працэс.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ